Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Грыцкевіцкая сярэдняя школа”

# ГУТАРКА АБ ВАЖНАСЦІ ПРАЦЫ ЛЮДЗЕЙ, ЯКІЯ ПРАЦУЮЦЬ У ДЗІЦЯЧЫМ САДЗЕ

аг. Грыцкевічы, 2022

Мэта: пашыраць веды дзяцей аб прафесіях работнікаў дзіцячага сада.

Выхавальнік: сёння выдатны дзень. Я рада бачыць вас у добрым настроі.

-Якая зараз пара года? (адказы дзяцей).

-Назавіце восеньскія месяцы. (адказы дзяцей).

-Якая важная падзея адбылася ў жыцці дзяцей? (адказы дзяцей).

-Цяпер я вам загадаю загадку, а вы паспрабуйце адгадаць.

Цэлы дзень без тат і мам
Праводзяць дзеці там... ( дзіцячы сад).

Выхавальнік: Правільна, дзеці. Кожную раніцу дзеці адпраўляюцца ў дзіцячы сад.

-Як вы думаеце, для чаго патрэбны дзіцячы сад? (адказы дзяцей).

-Сёння мы з вамі пазнаёмімся з прафесіямі работнікаў дзіцячага сада.

-Дзеці, а вы ведаеце, хто працуе ў дзіцячым садзе, людзі якіх прафесій? (адказы дзяцей).

-А з кім мы зараз сустрэнемся, вы даведаецеся, адгадаўшы загадку.

Загадка:

Хто, калі вы прыйдзеце ў садок,
Па галоўцы вас пагладзіць?
З кім вы дзень свой правожзіце,
Калі маці на рабоце?
Хто вам вершы прачытае,
Дасць пластылін і фарбы,
Маляваць, ляпіць навучыць,
Лыжкі раздаваць даручыць? (Выхавальнік)

Выхавальнік:

- Зараз я вам раскажу аб прафесіі выхавальніка. Калі вы прыходзіце ў дзіцячы сад вас сустракае ваш выхавальнік. Раніцаю выхавальнік робіць з дзецьмі зарадку - нескладаныя, але вельмі карысныя фізічныя практыкаванні. Пасля таго як вы добра памылі рукі з мылам, можна прыступіць да сняданку. За сняданкам выхавальнік уважліва сочыць, ці правільна вы трымаеце лыжку, сядзіце за сталом, навучае вас правілам этыкету. Пасля сняданку можна пад кіраўніцтвам выхавальніка заняцца якой-небудзь цікавай справай, напрыклад, зрабіць прыгожую аплікацыю, намаляваць карцінку. Вы вучыцеся апранацца, мыць правільна рукі, культурна паводзіць сябе за сталом. Выхавальнік павінен вельмі шмат умець і ведаць, каб кожны дзень для вас быў цікавым, каб вы пазнавалі нешта новае, каб у вас заўсёды быў добры настрой, каб вы раслі вясёлымі, разумнымі, добрымі дзецьмі.

Цяпер я вам загадаю загадку і мы даведаемся хто кожны дзень нам дапамагае?

З зоркай яснай, да цямна
У нашым садку яна.
Хто абед вам прынясе
І посуд прыбярэ?(Памагаты выхавальніка)

Выхавальнік: Правільна, дзеці!

Зараз я раскажу вам аб прафесіі памагатага выхавальніка.

Выхавальнік:

Шмат у яе працы. Яна, напэўна, не справілася б, калі б не яе памагатыя.

Жадаеце пазнаёміцца з некаторымі з іх?!

Выхавальнік: Я вам зараз загадаю загадкі, адгадаўшы іх вы даведаецеся, што ж гэта за памагатыя:

1) Скручаны, зверчаны па хаце скача. (Венік)

2) Ходзіць, блукае,
Смецце шукае. (Пыласос)

3) Пыл на шафе пратрэ
І стол у парадак прывядзе. (Анучка)

4) Увесь посуд перамые
І да бляску адатрэ. (Губка)

5) Калі ёсць у вас у гаспадарцы
Палка з анучай на канцы
То і група чысцей
І радасць на твары. (Швабра)

Выхавальнік: Правільна, дзеці. Усе гэтыя прадметы служаць чысціні і парадку, таму самі яны таксама любяць парадак. Іх заўсёды патрэбна ставіць на месца, інакш яны не будуць дапамагаць. (прыбірае прадметы на месца).

Выхавальнік: Працягваем далей. Адгадайце загадку, пра каго яна?

Скажы, хто так смачна
Гатуе суп,
Пахкія катлеты,
Салаты, вінегрэты,
Усе сняданкі, абеды? (кухар)

Выхавальнік: Правільна. Раніцай яна прыходзіць на працу. Тым часам нікога ў дзіцячым садзе няма, акрамя вартаўніка. І пачынае гатаваць вам смачную ежу. Калі вы раніцай прыйдзеце, ужо ўсё для вас будзе гатова. Потым вам прыгатуе сытны абед, увечары вас будзе чакаць вячэра. Расціце здаровымі і моцнымі.

Выхавальнік: А зараз мы пазнаёмімся з музычным работнікам. Як яго завуць? ( Адказы дзяцей)

Ён вучыць дзяцей спяваць, прыгожа танчыць.

Выхавальнік: Працягваем далей. Адгадайце загадку, пра каго яна?

Ён галоўны самы,
Ёсць у яго свой кабінет. (Дырэктар)

Выхавальнік:

Як завуць нашага дырэктар?(Адказы дзяцей). Дырэктар кіруе работай дзіцячага сада. Уяго шмат важных справаў.

Вось мы і пазнаёміліся з некаторымі работнікамі дзіцячага сада.